ВЕКАПОМНАЕ

# “МАРШ ЖЫЦЦЯ”,

**прысвечаны 70-годдзю трагедый “лунінецкіх Хатыняў”, адбыўся на базе сельгаскаледжа.**

*— Помнікі ў гарадах і ў кожнай вёсцы штодня нагадваюць пра трагедыі Вялікай Айчыннай. У народзе кажуць: калі пра вайну забываюцца, пачынаецца новая. Каб не дапусціць гэтага, мы і праводзім мітынг-рэквіем памінання ахвяр фашызму сярод мірнага насельніцтва...*

Старшыня Бастынскага сельсавета Фёдар Рашэцкі падкрэсліў, што не ўказана ў Хатыні вёска Белае Возера, знішчаная 19 студзеня 1944 года. Але праз 50 год пасля трагедыі на беразе быў узведзены помнік. Белы — як назва прыроднай жамчужыны нашага краю і наша святая памяць аб загінуўшых...

Юнакі і дзяўчаты называюць вёскі, дзе загінулі дзясяткі мірных жыхароў. Яны не пазначаны на сімвалічных Дрэвах Жыцця ў Хатыні, у спісе 433 беларускіх вёсак, якія паўсталі з небыцця. Занатаваны тут толькі 13 паселішчаў з указаннем “Лунінецкі раён”. Аб трагедыі Лугоў, на падставе ўспамінаў відавочцаў, расказвае старшыня Чучавіцкага сельсавета Аляксандр Соц.

Для жыхароў Лунінца ўвасабленне пакут перыяду акупацыі — Курган Бессмяротнасці. Своеасаблівая брацкая магіла, дзе, згодна з архіўнымі дадзенымі, знайшлі вечны спакой 805 мірных жыхароў, у тым ліку 336 жанчын і 205 дзяцей, а таксама 2813 ваеннапалонных салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі. Аб сям'і Дзямід, якая была расстраляна 9 мая 1944 года,



расказала старшыня раённага савета ветэранаў педагагічнай працы Наталля Казанкова.

У памінальным мерапрыемстве прынялі ўдзел былыя партызаны. Міхаіл Канапацкі цудам выратаваўся ў час знішчэння Мелясніцы, дзе загінулі родныя... У Ганны Жук 31 кастрычніка 1943 года ва урочышчы Баханова быў расстраляны бацька. Яе дачка Ніна Сяліцкая, цяперашняя жыхарка Міншчыны, якая наведала малую радзіму, ніколі не бачыла свайго дзеда... Сціплы помнік на кургане лічым і гістарычным, і літаратурным — занатаваны ў кнізе Уладзіміра Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”. Плакала лунінчанка Вольга Транава:

*— Дзесяць душ з маёй сям'і загінулі ў адзін дзень — 21 верасня 1943 года...*

У Бога нічога не бывае выпадковым. Сёлета ў Лунінцы асвячана царква іконы Божай Маці “Взыскание погибших”. Першая літургія ў часовым будынку адбылася 21 верасня 2006 года...

Пранікнёна правялі мітынг-рэквіем Кацярына Сайко і Віталь Кокараў. Яны разам з сябрамі актыўна ўдзельнічаюць у валанцёрскім руху на чале з педагогам-псіхолагам Янінай Лушчык. Загадчыкі аддзяленняў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ірына Мархотка і Лідзія Чыжакова паведамілі пра дапамогу навучэнцаў каледжа многім лунінчанам — “дзецям вайны” ў рамках праекта “Актыўнае цяперашняе пажылых людзей”. Прагучаў і такі прыклад: старыя падапечныя не вельмі ахвотна згаджаліся пускаць моладзь у кватэры, каб вымыць вокны. Калі ж справа была зроблена, сталі прасіць і аб пральных паслугах — такі давер выклікалі юнакі і дзяўчаты! Каардынатары праекта падзякавалі педагогам і навучэнцам, уручылі салодкія пачастункі актывістам...

Мартыралог памяці завяршыўся вершамі былога выхаванца Мікашэвіцкага дзіцячага дома паэта Уладзіслава Нядзведскага, імя якога цяпер носіць гімназія:

*Я помню ўсё... Як вывадак звярыны*
*Жывых дзяцей у ямы заганяў,*
*Я помню крыж фашысцкі*
*на машыне...*
*Праклён табе, праклён табе, вайна!*
*Я помню ўсё... І як гарэлі людзі,*
*Ліпучы снег, што кроўю набрыняў,*
*Мне крык памерлых*
*раздзірае грудзі:*
*Праклён табе, праклён табе, вайна!*

Своеасаблівым хрэсным шляхам, які назвалі “Маршам жыцця”, падышлі да Кургана Бессмяротнасці і ўсклалі вянкі.

У Бога няма мёртвых — усе жывыя. І лепшая памяць — гэта малітва. Настаяцель храма іерэй Сергій Крышталь адслужыў лiцію па ахвярах фашызму. Полымя сэрцаў, поўных любві да жыцця, перайшло ў полымя свечак памяці.

Старшыня Гарадоцкага сельсавета Дзям'ян Бірыла адзначыў:

*— Падалося вельмі сімвалічным, што памінанні 70-годдзя трагедый сёлета пачаліся 19 студзеня ў Цне — і завяршыліся ў каледжы, які ўзначальвае ўраджэнец вёскі...*

Удзельнікі мітынгу-рэквіему разыходзіліся, калі да брамы храма пад'ехаў вясельны картэж. Маладажоны ўсхвалявана ўзнімаліся па царкоўных прыступках на вянчанне, сцвярджаючы спрадвечнасць і неўміручасць жыцця.

